ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

# Гербоўнік беларускай шляхты

ТОМ 7

## З І

Мінск
«Беларусь»
2020

УДК 929.5/.6(476)
ББК 63.2(4 Беи)
Г37

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

А ў т а р ы:
*Я. С. Глінскі* (кіраўнік), *Г. М. Мажэйка*,
*Ю. М. Снапкоўскі, В. В. Урублеўскі*

Н а в у к о в ы р э д а к т а р:
прафесар, доктар габілітаваны *А. Рахуба*

Р э д к а л е г і я:
*Д. У. Яцэвіч* (старшыня), *Р. С. Жаўняркевіч*,
*В. І. Кураш*, *Д. В. Лісейчыкаў*, *А. Я. Рыбакоў*

Р э ц э н з е н т ы:
доктар гістарычных навук *В. Ф. Голубеў*,
кандыдат гістарычных навук *В. С. Макарэвіч*

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы*
*Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**Гербоўнік беларускай шляхты.** Т. 7. З, І / Я. Глінскі [і інш.]; навук.
Г37 рэд. А. Рахуба. — Мінск : Беларусь, 2020. — 799 с. : [24] л. іл.
ISBN 978-985-01-1347-4.

Кніга – працяг шматтомнага выдання, распачатага ў 2002 г. У сёмым томе «Гербоўніка беларускай шляхты» пададзена 225 радаводаў шляхты пераважна Мінскай губерні з прозвішчамі на літары «З», «І», складзеных на падставе матэрыялаў фонду Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу.

Прызначаецца для шырокага кола чытачоў – прафесійных навукоўцаў, а таксама аматараў генеалогіі і геральдыкі, краязнаўцаў і ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй.

**УДК 929.5/.6(476)**
**ББК 63.2(4 Беи)**

**ISBN 978-985-01-1347-4**

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2020
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2020

# ПРАДМОВА

Сёмы том «Гербоўніка беларускай шляхты» (далей – «Гербоўнік»), выпушчаны **Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі** сумесна з **выдавецтвам «Беларусь»**, уключае радаводы шляхты, якая пераважна пражывала на тэрыторыі Мінскай губерні і мела прозвішчы, што пачыналіся на літары «З» і «І». Ён з’яўляецца часткай шматтомнага выдання, якое на працягу многіх гадоў выклікае трывалую цікавасць як у асяроддзі навуковай грамадскасці, так і ў аматараў гісторыі ў цэлым.

Даследаванне гісторыі шляхецкага саслоўя на беларускіх землях з’яўляецца адным з важных напрамкаў у сучаснай гістарыяграфіі. Аднак вывучэнне шляхецкай супольнасці як цэласнай структуры немагчыма без звароту ўвагі на мінулае асобных родаў, акалічнасці іх сямейнай гісторыі, у якіх часта адбіваліся падзеі не толькі лакальнага, але рэгіянальнага і нават дзяржаўнага значэння. У такім рэчышчы публікацыя тамоў «Гербоўніка» атрымлівае практычнае вымярэнне не толькі для генеалагічных і звязаных з імі прац, але таксама для шырокага кола навуковых даследаванняў. Несумненным станоўчым бокам выдання з’яўляецца характэрная для яго фактаграфічная насычанасць і ўвядзенне ва ўжытак вялікай колькасці звестак, узятых непасрэдна з архіўных матэрыялаў (пры абавязковай іх крытычнай апрацоўцы). Можна ўпэўнена сцвярджаць, што як прафесійныя навукоўцы, так і даследчыкі-аматары будуць яшчэ не раз звяртацца да яго ў сваёй дзейнасці.

* * *

Замыканне межаў шляхецкага саслоўя ў Рэчы Паспалітай адносіцца да другой паловы XVI ст.[1] Аднак і ў больш позні перыяд існавалі сацыяльныя групы, якія займалі прамежкавае становішча паміж паўнапраўнай павятовай шляхтай і прадстаўнікамі ніжэйшых саслоўяў. У першую чаргу гэта тычыцца зямян і баяр, якія пражывалі на землях буйных паноў і выконвалі на іх карысць разнастайныя павіннасці. У выпадку зямян асноўным абавязкам з’яўлялася ваенная служба, якую яны адбывалі ў прыватных харугвах. У сваю чаргу баярамі ў сярэдзіне XVII – сярэдзіне XVIII ст. называліся асобы, якія перш за ўсё былі адказныя за дастаўку грузаў і карэспандэнцыі[2]. Зрэшты, мяжа паміж імі была даволі няпэўнай[3], мелася тэндэнцыя да пераходу баяр на зямянскую службу, нават у тых валоданнях, дзе гэтыя дзве катэгорыі насельніцтва раней існавалі адначасова і адрозніваліся павіннасцямі. Такія працэсы былі асабліва характэрны для XVIII ст., але назіраліся і раней. У маёнтку Старыца Капыльскага княства, дзе да вайны 1654–1667 гг. пражывалі як зямяне, так і баяры (з адрозным наборам абавязкаў), пасля яе ўсе яны былі пераведзены на зямянскую павіннасць[4].

Зямяне з улікам нясення імі ваеннай службы ў большай ступені набліжаліся да паўнапраўнай шляхты, чым баяры, якія ў гістарыяграфіі традыцыйна акрэсліваюцца як сяляне-слугі. Але асобныя прадстаўнікі абедзвюх гэтых катэгорый у новых умовах, якія ўзніклі пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст., маглі прэтэндаваць на прызнанне ў шляхецкай (дваранскай) годнасці. У многіх выпадках неабходнасць пацвярджаць высакароднае паходжанне прымушала нашчадкаў зямян і баяр зацямняць акалічнасці родавай гісторыі XVII–XVIII стст., а часам нават адкрыта яе містыфікаваць. Таму для высвятлення іх сапраўдных каранёў неабходна звяртацца не толькі да звестак спраў аб дваранскім паходжанні, але таксама да незалежных крыніц — перш за ўсё інвентароў і іншай дакументацыі маёнткаў, у якіх зямяне і баяры трымалі зямлю.

У гэтым кантэксце паказальным з’яўляецца прыклад касцельных уладанняў Цялядавічы і Вялешына Слуцкага павета. Большасць мясцовых баяр у XIX ст. атрымала прызнанне ў дваранстве, нягледзячы на тое, што ў дачыненні да легітымацыі некаторых з іх (Гедрановічаў, Нічыпяровічаў, Цераховічаў) супраць выступіў уласнік зямлі, на якой яны пражывалі, – Нясвіжскі жаночы бенедыктынскі кляштар, які лічыў іх сваімі прыгоннымі сялянамі[5]. Відавочна, цялядавіцкія і вялешынскія баяры, якія захоўвалі гэты статус яшчэ ў канцы XVIII ст.[6], не маглі пахваліцца развітым комплексам сямейных дакументаў. Таму нават у першых вывадах яны вымушаны былі выкарыстоўваць выразныя падробкі. Напрыклад, Валогі з засценка Галяеўшчына падчас «разбору шляхецтва» надалі ўласнаму прозвішчу форму «Валажынскія» і, сярод іншага, падавалі яскравы фальсіфікат – нібыта прывілей Жыгімонта III ад 1589 г. на маёнтак Валожыцы[7]. Цікавым наборам несапраўдных дакументаў распараджаліся згаданыя вышэй Нічыпяровічы: яны падавалі прывілей Жыгімонта I ад 1502 г. на зямлю ў Вількамірскім павеце і прывілей князя Юрыя Алелькавіча-Слуцкага ад 1508 г. на зямлю Лавы ў «Клецкай парафіі»[8]. Няцяжка заўважыць, што гэтыя дакументы вылучаюцца грубымі анахранізмамі. У 1502 г. вялікім князем літоўскім быў старэйшы брат Жыгімонта I Аляксандр, а Клеччына ў гэты перыяд належала не Алелькавічам, а князям Яраславічам.

Сацыяльна-прававое становішча цялядавіцкіх і вялешынскіх баяр істотна змянілася толькі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст., калі яны пачалі даказваць уласнае шляхецтва. У сваю чаргу іншыя прадстаўнікі ваенна-служылага насельніцтва маглі значна раней узвысіцца да становішча паўнапраўнай шляхты. У інвентары ад 1558 г. у маёнтку Хажова (Хажовая) Ашмянскага павета сярод мясцовых баяр, верагодна, былі паказаны продкі роду Гнатоўскіх[9], які ўжо па стане на другую палову XVII ст. адносіўся да павятовай шляхты[10].

Зафіксаваны выпадкі, калі статус прадстаўнікоў асобнага роду неаднаразова і істотна змяняўся на працягу XVI – пачатку XIX ст. У 1567 г. на попіс войска ВКЛ у складзе навагрудскай павятовай харугвы выходзілі носьбіты прозвішча Жыбартовіч[11]. Верагодна, іх родзічамі былі баяры Жыбуртовічы, якія па стане на сярэдзіну XVII ст. сваёй зямлі ўжо не мелі, а пражывалі на ленных валоках у сяле Морач маёнтка Астроўчыцы Клецкага княства. У гэты час іх павіннасці (чынш, пешая і конная дастаўка лістоў, удзел у паляванні на карысць двара) нічым не адрозніваліся ад павіннасцей іншых мясцовых баяр[12]. У першай палове наступнага стагоддзя Жыбуртовічы па-ранейшаму пражывалі на баярскіх валоках у Морачы, але баяры з іншых вёсак маёнтка ў гэты час ужо ператварыліся ў зямян[13]. У сваю чаргу Жыбуртовічы пераважна заставаліся баярамі нават у сярэдзіне XVIII ст.[14], а на зямянскую службу былі канчаткова пераведзены толькі ў другой палове гэтага стагоддзя[15]. Нягледзячы на такую трывалую прыналежнасць да баярскага стану, Жыбуртовічы ў 1816 г. атрымалі прызнанне ў дваранстве, а ў 1852 г. былі зацверджаны ў ім Дэпартаментам Герольдыі Сената[16]. Таксама былі прызнаны і зацверджаны ў дваранстве ў Расійскай імперыі Жывіцкія, якія яшчэ ў 50-я гг. XVIII ст. лічыліся баярамі фальварка Атцэда Мінскага ваяводства[17]. Найбольш пераканаўчай выглядае версія, што атцэдаўскія Жывіцкія былі адгалінаваннем старажытнага роду Жывіцаў, які паходзіў з размешчанага непадалёк маёнтка Рубяжэвічы, дзе яго прадстаўнік быў зямянінам ужо ў 1620 г.[18]. Прынамсі, у інвентары ад 1702 г. продак будучых Жывіцкіх паказаны менавіта з прозвішчам Жывіца[19]. Пры гэтым Жывіцы з Рубяжэвічаў і Койданаўскага графства ў XVIII ст., як і раней, знаходзіліся менавіта на зямянскай службе. Атцэдаўскія баяры ў 1761 г. атрымалі прывілей князя Міхала-Казіміра Радзівіла на леннае трыманне 5 валок[20], з гэтага моманту яны таксама маглі лічыцца зямянамі. Больш ранніх дакументаў, якія б маглі пацвердзіць іх высакароднае паходжанне, у прадстаўнікоў роду не мелася. Таму нават у першым вывадзе (ад 1811 г.) яны вымушаны былі апеляваць да паходжання ад аднайменнай брэсцкай шляхты[21], якога, напэўна, не мелі.

Не заўсёды, аднак, рознае найменне ў інвентарах XVIII ст. адлюстроўвала наяўнасць фактычных асаблівасцей у статусе той ці іншай групы насельніцтва. У 1761 г. жыхары засценка Сцяпуры (маёнтак Цімкавічы Навагрудскага ваяводства) былі пазначаны баярамі, але іх павіннасці істотна не адрозніваліся ад тых, што выконвалі зямяне з суседняга засценка Чарнагубава. Ужо ў 1778 г. сцяпураўцы запісаны зямянамі[22], а іх павіннасці зноў рэзка не вылучаліся на фоне абавязкаў гістарычных зямян.

Але, у цэлым, у радзівілаўскіх валоданнях у Цэнтральнай Беларусі (Нясвіжская ардынацыя, Слуцкае, Капыльскае і Клецкае княствы) у XVII–

XVIII стст. ваеннаслужылае насельніцтва (зямяне) выразна адасаблялася ад паншчыннага і чыншавага сялянства. Больш складаным быў сацыяльны падзел у маёнтках, размешчаных ва Усходняй Беларусі. Нават у XVII–XVIII стст. ваенныя павіннасці ў іх выконвалі вярхі сялянскага саслоўя, якія акрэсліваліся як путныя і панцырныя баяры[23]. Пры гэтым, апрача падобных ваенных слуг, у асобных маёнтках фіксаваліся і звычайныя зямяне[24], якія, верагодна, усведамлялі сябе шляхтай. Характэрным прыкладам маёнтка, дзе паралельна існавалі дзве гэтыя катэгорыі насельніцтва (зямяне і ваенныя сяляне-слугі), з'яўлялася Дуброўненскае графства Аршанскага павета. У першай палове XVIII ст. у яго складзе вылучаліся «Зямянскае паручнікоўства» і «Памежнае каменданцтва»; апошняе якраз было населена панцырнымі баярамі[25]. Пры гэтым у канцы XVIII – пачатку XIX ст. на прызнанне ў шляхецтве прэтэндавалі асобныя роды з абедзвюх супольнасцей. Так, у 1774 г. Аршанскім правінцыйным судом было пацверджана шляхецкае паходжанне роду Згарэльскіх[26]. Іх продак Фёдар Згарэльскі быў дуброўненскім зямянінам яшчэ ў 1672 г.[27] У сваю чаргу ў «Памежным паручнікоўстве» існаваў абруб Жабыкі, жыхарамі якога ў большасці былі носьбіты адпаведнага прозвішча. У 1793 г. яны рабілі вывад у Магілёўскім ДДС, выводзячы сябе ад жыхароў Троцкага павета, якія ў канцы XVI ст. нібыта пераехалі ў Дуброўненскае графства[28]. Такое паходжанне вельмі сумнеўнае. Відавочна, Жабыкі былі старажытнымі мясцовымі панцырнымі баярамі, якія ва ўмовах адсутнасці дакументаў для доказу шляхецтва вымушаны былі апеляваць да ўяўнага паходжання з гістарычнай Літвы.

Меліся выпадкі пранікнення ў шляхецкую супольнасць былых прадстаўнікоў чыншавага і нават паншчыннага сялянства. У 1802 г. у дваранстве былі прызнаны Савічы, якія пераважна пражывалі ў вёсцы Валосавічы Бабруйскага павета і размешчаным непадалёк ад яе засценку Забалоцце. Ужо ў 80-я гг. XVIII ст. яны атрымалі пасведчанне аб супольным паходжанні ад шляхціцаў такога ж прозвішча з Браслаўскага павета (сфарміраваная на падставе гэтых дакументаў генеалагічная схема трапіла ў вывад ад 1802 г.)[29]. Больш за тое, асэнсаванне валосавіцкіх Савічаў як шляхты ў 80-я гг. XVIII ст. прасочваецца па незалежных крыніцах. Некаторыя з іх у гэты час ужо называюцца «панамі» ў метрычных запісах Бабруйскага касцёла і Міхалёўскай уніяцкай царквы[30]. Інакш сітуацыя выглядала ў папярэдні перыяд. Паводле інвентара маёнтка Міхалёва Рэчыцкага павета ад 1743 г., Савічы таксама жылі ў вёсцы Валосавічы, але адносіліся да цяглых сялян[31]. Параўнанне імён Савічаў з інвентара і адпаведных людзей, паказаных у вывадзе ад 1802 г., не пакідае сумненняў у іх тоеснасці. У 1743 г. у адным з вясковых дымоў жылі браты Якім і Марцін, тыя ж людзі таксама названы братамі (і сынамі Ціта) у 1802 г. У інвентары ад 1743 г. згаданы цяглы селянін Сямён, які меў сыноў

Андрэя і Самуся; у 1802 г. Сямёнператварыўся ў Сымона, а з яго сыноў у пакаленным роспісе застаўся толькі Самусь (Самуэль)[32]. На жаль, з-за непаўнаты крыніц немагчыма прасачыць ні час, ні акалічнасці пераходу былых сялян Савічаў у шляхецкія шэрагі.

У рэвізскай сказцы 1795 г. і пасямейных спісах канца XVIII ст. у іншым маёнтку былога Рэчыцкага павета – Плесавічах – сярод жыхароў вёскі Змяёўка была занатавана дастаткова вялікая колькасць чыншавай шляхты (Арлоўскія, Бараноўскія, Богушы, Корбуты, Крукоўскія, Навіцкія)[33]. Пры гэтым у метрычных кнігах Казіміраўскай і Плесавіцкай цэркваў за 20–80-я гг. XVIII ст. згаданыя ў 1795 г. асобы і іх продкі нярэдка акрэсліваліся як сяляне; больш за тое, яны фігуравалі з іншымі, не характэрнымі для шляхты прозвішчамі (Арлоўскія пазначаліся як Гарловічы і Фалейчукі, Навіцкія як Мікалайчыкі і Новікі, Бараноўскія і Крукоўскія адпаведна як Бараны і Круковічы)[34]. У пасямейных спісах канца XVIII ст., сярод іншых, згадваліся шляхціцы Стэфан і Мацей Дзмітрыевічы Навіцкія[35]. Метрычная кніга Казіміраўскай царквы дае дакладную дату хрышчэння першага з іх – 4 студзеня 1756 г., але ён запісаны сынам сялян Дзімітра і Алёны Мікалайчыкаў. У сваю чаргу 8 верасня 1765 г. быў ахрышчаны яго брат Мацей, але ўжо як сын Дзімітра і Алены Навіцкіх. Апрача таго, брат Стэфана і Мацея Якаў 20 снежня 1768 г. быў названы сынам Дзімітрыя і Алены Новікаў (!)[36]. Але ў выключных выпадках некаторыя мясцовыя жыхары называліся зямянамі. Той жа Дзмітрый Навіцкі ў 1754 г. узяў шлюб[37] са шляхцянкай з ваколіцы Сенажаткі Аленай Стралкоўскай (маці яго адзначаных вышэй дзяцей), у запісе аб вянчанні ён названы «зямянінам». Таксама ў 1778 г. адбылося хрышчэнне Юзафа, сына зямян Тараса і Кацярыны Бараноўскіх[38]. Верагодна, частка насельніцтва Змяёўкі сапраўды выконвала спецыфічныя павіннасці, якія нагадвалі традыцыйныя зямянскія або баярскія. Зрэшты, мяжа паміж імі і звычайнымі сялянамі, якія пражывалі ў той жа вёсцы, была даволі невыразнай. Тым не менш ужо ў 1795 г. яны трапілі ў сказкі як паўнапраўная чыншавая шляхта[39]. Частка з іх дагэтуль (у 1794 г.) вяла працэс супраць адміністрацыі маёнтка Плесавічы, сцвярджаючы, што тая прымушала іх, вольную шляхту-арандатараў, да выканання сялянскіх павіннасцей. Напрыклад, Арлоўскія выводзілі сябе з Навагрудскага ваяводства і сцвярджалі, што пасяліліся ў Змяёўцы пасля Паўночнай вайны і сапраўды часам называліся Фалейчукамі. Зрэшты, ва ўвядзенні апошняга прозвішча яны абвінавачвалі якраз мясцовых аканомаў, якія *«імкнуліся сцерці і занядбаць сляды іх шляхецтва»*[40]. Такая інтэрпрэтацыя родавай гісторыі выклікае пэўныя сумненні. Ужо ў самых ранніх метрычных кнігах Казіміраўскай царквы (за 1730-я гг.) продкі Арлоўскіх фігуравалі як Горлы (Гарловічы), таксама яны запісваліся пад разнастайнымі варыянтамі прозвішча-мянушкі Фалейчук[41].

Напэўна, гэта і былі іх першасныя прозвішчы, а Арлоўскімі яны сталі толькі ў канцы XVIII ст.

Неабходна адзначыць, што нашчадкі зямян і баяр у XIX ст. складалі істотную частку дробнашляхецкай супольнасці беларускіх зямель. Асабліва шмат прадстаўнікоў ваенна-служылага насельніцтва пражывала ў Мінскай губерні, дзе знаходзіліся вялікія валоданні князёў Радзівілаў, у якіх традыцыйна была высокая канцэнтрацыя зямян і баяр. Гэтыя катэгорыі насельніцтва, як правіла, не мелі развітага комплексу фамільных дакументаў, таму пры даследаванні іх родавай гісторыі за XVII–XVIII стст. трэба памятаць пра яе ўрыўкавы характар і магчымасць фальсіфікацый нават у ранніх вывадах шляхецтва.

* * *

У 2017–2019 гг. у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі працягвалася распрацоўка планавай навуковай тэмы «Генеалогія і геральдыка шляхецкіх родаў Беларусі», адным з вынікаў ажыццяўлення якой стала падрыхтоўка дадзенага тома «Гербоўніка». Ён ахоплівае радаводы шляхты пераважна Мінскай губерні, чые прозвішчы пачынаюцца на літары «З», «І», і змяшчае 225 артыкулаў. Як і ў папярэдніх тамах, у яго ўключаны і тыя роды, што маюць падвойнае прозвішча, асноўная частка якога пачынаецца на вышэйзгаданыя літары – «Грудзіны-Забароўскія», «Хрчоны-Забелы», «Савічы-Заблоцкія», «Музылы-Завадскія», «Рагалі-Святаполкі-Завадскія», «Голдыкі-Завітневічы», «Чорныя-Завішы», «Фтэрапантовічы-Загароўскія», «Хосты-Загорскія», «Фастовічы-Загорскія», «Дземяшкевічы-Закрэўскія», «Праневічы-Заламаі», «Шлюбічы-Заленскія», «Кердзяевічы-Замайскія», «Корвіны-Златагорскія», «Праскуры-Змечароўскія», «Гераны-Змітровічы», «Аколавы-Зубкоўскія», «Эйдзятовічы-Зубовічы», «Розэны-Зэндлігеры», «Івашкевічы-Кузьміцкія», «Рудашанскія-Івашкевічы», «Рыбчыцы-Ільніцкія», «Агнусы-Ісакевічы». Традыцыйна ў том не ўключаліся тыя роды, у якіх з належных літар пачынаецца толькі прыдомак – «Заштаўтовічы-Бразоўскія», «Іжыцкія-Гэрманы», «Запольскія-Доўнары», «Карзюкі-Залескія», «Лянкевічы-Іпагорскія», «Зяновічы-Ляшкевічы-Альпінскія» («Зінавовічы-Ляшкевічы-Альпенскія»), «Землічы-Паступальскія», «Струмілы-Згерскія», «Рабцэвічы-Зубкоўскія», «Зяньковічы-Тоўкачы».

Артыкулы, уключаныя ў гэты том, напісаны паводле той жа схемы, што была выкарыстана ў папярэдніх тамах, і складаюцца з 5 частак:

1) прозвішча роду, магчымы прыдомак, герб;

2) звесткі пра легенды аб паходжанні роду або найбольш старажытных вядомых прадстаўнікоў;

3) пакаленны роспіс, створаны на падставе матэрыялаў, пададзеных у Мінскі ДДС;

4) звесткі пра зацвярджэнне ці незацвярджэнне роду ў расійскім дваранстве ўказамі Сената;

5) крыніцы, на падставе якіх напісаны артыкул.

Апрача таго, вялікая ўвага надаецца ўключэнню ў артыкулы звестак пра тых асоб, чые дакументы маюцца ў справах аб дваранскім паходжанні таго ці іншага роду, аднак іх сваяцкія сувязі з ім не ўдаецца вызначыць. Артыкулы змяшчаюць даволі падрабязныя каментарыі, куды выносяцца звесткі пра сумнеўныя і сфальсіфікаваныя дакументы (на што звяртаецца асаблівая ўвага), аўтарскія заўвагі і тлумачэнні наконт асаблівасцей канкрэтных радаводаў.

Падставай для напісання сёмага тома па-ранейшаму з'яўляюцца справы фонду Мінскага ДДС (ф. 319, вопісы 1 і 2). Звесткі, змешчаныя ў іх, пры неабходнасці маглі дапаўняцца іншымі матэрыяламі (архіўнымі і апублікаванымі дакументамі, навуковай літаратурай), калі яны меліся ў таго ці іншага аўтара падчас напісання артыкула. Аднак пошук гэтых дадатковых матэрыялаў у якасці асобнай задачы не ставіцца. Не варта забывацца, што справы аб дваранскім паходжанні не з'яўляюцца адзінымі крыніцамі па гісторыі шляхецкіх родаў Беларусі. Кола гэтых крыніц вельмі вялікае, таму абсалютызацыя прынцыпу ўсеагульнасці крыніц для напісання таго ці іншага артыкула вяла б да бясконцага расцягвання выхаду нават аднаго тома «Гербоўніка» і зрабіла б яго выданне немагчымым.

Сёмы том, як і папярэднія, забяспечаны паказальнікамі імёнаў і геаграфічных назваў. Да яго дадаюцца таксама каляровыя выявы часткі гербаў шляхецкіх родаў, якія маюцца ў матэрыялах фонду (у справах аб паходжанні асобных родаў і кнігах вывадовых пратаколаў), і асобныя генеалагічныя табліцы. Змяшчэнне ўсіх наяўных гербаў і генеалагічных табліц, на жаль, немагчымае з прычыны абмежаванага аб'ёму тома і памераў некаторых з іх. Паколькі дзякуючы сучасным інфармацыйным тэхналогіям выявы гербаў сталі лёгкадаступнымі для даследчыкаў, у гэты том уключаны толькі тыя выявы, якія змешчаны ў дакументах самімі прадстаўнікамі роду, нават калі малюнкі выкананы на дастаткова прымітыўным узроўні.

У гэтым томе, як і ў папярэдніх, пазначэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці населеных пунктаў здзейснена наступным чынам. У выпадку, калі звесткі тычацца перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, пазначаецца толькі павет або ваяводства (напрыклад, Рэчыцкі пав., Навагрудскае ваяв. і да т. п.). Калі ж звесткі адносяцца да перыяду Расійскай імперыі, указваюцца як павет, так і губерня (напрыклад, Мазырскі пав. Мінскай губ., Полацкі пав. Віцебскай губ. і да т. п.).

Аўтарскі калектыў выказвае шчырую падзяку ўсім, хто дапамагаў пры складанні гэтай кнігі: дырэктару Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Дзмітрыю Уладзіміравічу Яцэвічу за арганізацыйную дапамогу ў выданні, а таксама ўсім супрацоўнікам архіва, якія мелі дачыненне да падрыхтоўкі тома.

**Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі** працягвае працу па складанні чарговых тамоў «Гербоўніка». Наступным рыхтуецца том, куды будуць уключаны каля 600 артыкулаў з радаводнымі роспісамі шляхты зноў пераважна Мінскай губерні, чые прозвішчы пачынаюцца на літару «К».

---

[1] Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя: у 2 т. – Т. 1: Абаленскі – Кадэнцыя / 2-е выд. – Мінск: БелЭн, 2007. – С. 72–75.

[2] *Доўнар, А. Б.* Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. – Мінск: Беларуская навука, 2007. – С. 55.

[3] Тым больш невыразнай яна была ў больш ранні перыяд. Так, у другой палове XVI – першай палове XVII ст. баярамі пераважна называліся менавіта ваенныя службоўцы і толькі затым за апошнімі замацавалася назва «зямяне» (*Sienkiewicz, W.* Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVII do połowy XVIII wieku. Studium z dziejów feudalizmu litewskiego: maszynopis pracy doktorskiej. – Warszawa, 1982. – S. 12–23; *Доўнар, А. Б.* Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. – Мінск: Беларуская навука, 2007. – С. 50).

[4] НГАБ. Ф. 160, воп. 1, спр. 16, арк. 331–333 адв., 415 адв.–416, 461 адв.–462, 464, 465. Іншыя прыклады ператварэння баяр у зямян гл. *Доўнар, А. Б.* Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. – Мінск: Беларуская навука, 2007. – С. 53–54.

[5] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2251, арк. 100–111; Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 4: Г. – Мінск: Беларусь, 2016. – С. 319–327.

[6] НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 1208, арк. 3–4; спр. 8986, арк. 15 адв.–17.

[7] Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 3: В. – Мінск: Беларусь, 2014. – С. 119–122.

[8] НГАБ. Ф. 319, воп. 1, спр. 915, арк. 244–248 адв.; воп. 2, спр. 2251, арк. 108–111.

[9] *Брэгер, Г.* Невядомы інвентар маёнткаў Лебедзева і Хажовая 1558 г. // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Вып. 32. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – С. 202.

[10] Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 4: Г. – Мінск: Беларусь, 2016. – С. 451–454. Іншыя падобныя прыклады гл. *Sienkiewicz, W.* Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVII do połowy XVIII wieku. Studium z dziejów feudalizmu litewskiego: maszynopis pracy doktorskiej. – Warszawa, 1982. – S. 114–130.

[11] Русская историческая библиотека. – Т. 33: Литовская Метрика. Отд. 1. – Ч. 3: Книги Публичных дел. Переписи войска литовского / Подгот. С. Л. Пташицкий. – Петроград: Типография Главного управления уделов, 1915. – Стб. 820, 831.

[12] НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 6085, арк. 11 адв.–14.

[13] НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 6089, арк. 12–18, 39–41 адв.

[14] Інвентар ад 1748 г. (Lietuvos valstybės istorijos archyvas (далей – LVIA). F. 1280, ap. 1, b. 1217, l. 2–2 v.).

[15] LVIA. F. 1280, ap. 1, b. 1218, l. 78, 85.

[16] Іх сапраўдныя родавыя дакументы абмяжоўваліся паперамі аб застаўным валоданні за 10–60-я гг. XVIII ст. Зразумела, што ў такім выпадку ім патрабаваўся істотны комплекс фальшывых дакументаў, які быў пададзены ў Мінскі ДДС у 1836 г. (НГАБ. Ф. 319, воп. 1, спр. 71, арк. 94–97 адв.; спр. 230, арк. 587–589 адв.; воп. 2, спр. 1081).

[17] НГАБ. КМФ 5, воп. 1, спр. 2813, арк. 10; спр. 2814/1, арк. 6; спр. 2815/1, арк. 8.

[18] Аднак у тым жа 1620 г. іншы Жывіца быў паказаны селянінам таго ж маёнтка (НГАБ. КМФ 5, воп. 1, спр. 1697, арк. 256; ф. 694, воп. 7, спр. 994, арк. 107–108 адв.).

[19] НГАБ. КМФ 5, воп. 1, спр. 2812, арк. 6.

[20] НГАБ. Ф. 694, воп. 4, спр. 1352, арк. 56 адв.–58.

[21] НГАБ. Ф. 319, воп. 1, спр. 809, арк. 57–61. Прыклад існавання баяр у прыватнаўласніцкіх маёнтках нават у 80-я гг. XVIII ст. гл. *Сцебуракa, А.* «Я, да жалю, не пан…» (Зямяне ўладання Ганута князёў Агінскіх) // Вілейскі павет. Гісторыка-краязнаўчы гадавік. – Вып. 4. – Мінск: А. М. Янушкевіч, 2019. – С. 12–14. Іншая справа, што ў гэтым выпадку баяры ўжо маглі быць тоеснымі чыншавым сялянам. Такая магчымасць (на матэрыяле іншых валоданняў, які, аднак, не заўсёды карэктна інтэрпрэтаваўся) адзначалася ў ранейшай гістарыяграфіі — перш за ўсё Дзмітрыем Пахілевічам (*Похилевич, Д. Л.* Крестьяне-слуги в Великом Княжестве Литовском в XVII–XVIII веках // Средние века: сборник. – 1962. – Вып. 21. – С. 159–160).

[22] НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 8437, арк. 20 адв.–21; Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII–XVIII вв.: Владение Тимковичи / Сост. П. Г. Козловский, Е. П. Шлоссберг, Е. Л. Бравер. – Минск: Наука и техника, 1982. – С. 200.

[23] *Похилевич, Д. Л.* Крестьяне-слуги в Великом Княжестве Литовском в XVII–XVIII веках // Средние века: сборник. – 1962. – Вып. 21. – С. 149–152; *Голубеў, В., Доўнар, А.* Панцырныя баяры Беларусі ў другой палове XVI – першай палове XVII стагоддзя (на прыкладзе Азярышчанскага староства) // Крізь століття. Студії на пошану Миколи Крикуна з нагоди 80-річчя. – Львів: НТШ у Львові, 2012. – С. 268–282.

[24] Пра зямян на ўсходнебеларускіх землях гл. *Baranowski, I.* Trzy hrabstwa białoruskie // Wieś i folwark. Studya z dziejów agrarnych Polski. – Warszawa; Poznań: Księgarnia W. Jakowickiego; M. Niemierkiewicz, 1914. – S. 262–263, 268–269.

[25] НГАБ. Ф. 3258, воп. 1, спр. 8, арк. 33–49, 57–68; спр. 10, арк. 26 адв.–54.

[26] НГАБ. Ф. 1946, воп. 1, спр. 1, арк. 641–642 адв.; *Анищенко, Е. К.* Шляхта Оршанского повета: Список XVIII ст. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2015. – С. 6.

[27] НГАБ. Ф. 3258, воп. 1, спр. 1, арк. 18 адв.

[28] НГАБ. Ф. 3258, воп. 1, спр. 8, арк. 33; спр. 10, арк. 38; *Залівака, А.* Шляхта Магілёўскай губерні. Радаводы. – Фасцыкул 3. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2013. – С. 72–74.

[29] НГАБ. Ф. 319, воп. 1, спр. 34, арк. 110 адв.–112 адв.; воп. 2, спр. 2860, арк. 94–95; ф. 1736, воп. 1, спр. 34, арк. 731–735 адв.

[30] НГАБ. Ф. 136, воп. 13, спр. 670, арк. 24; ф. 937, воп. 4, спр. 12, арк. 44 адв., 49, 51 адв., 90 адв., 92.

[31] НГАБ. Ф. 1783, воп. 1, спр. 10, арк. 658–659.

[32] Апрача таго, верагодна, згаданы ў 1743 г. селянін Ахрэм Савіч (з сынамі Максімам і Хведарам) падчас «разбору шляхты» атрымаў больш «шляхецкае» імя Ануфры, пад якім (разам з сынам Тэадорам!) трапіў у матэрыялы справы аб дваранскім паходжанні (НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2860, арк. 82–83).

[33] НГАБ. Ф. 333, воп. 9, спр. 21, арк. 850–854.

[34] На варыятыўнасць прозвішчаў для рэалій XVIII–XIX стст. (але пераважна на матэрыяле, звязаным з сялянскім саслоўем) звяртаецца ўвага ў сучаснай гістарыяграфіі, гл. *Урублеўскі, В. В.* Зменлівасць беларускіх сялянскіх прозвішчаў у Мінскай губерні (канец XVIII – пачатак XX ст.) // Беларускія архівы на мяжы тысячагоддзяў: здабыткі і страты: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск, 28 чэрвеня 2018 г.). – Мінск: БелНДІДАС, 2019. – С. 375–386.

[35] НГАБ. Ф. 319, воп. 1, спр. 34, арк. 76 адв.–78.

[36] НГАБ. Ф. 136, воп. 13, спр. 644, арк. 16 адв., 46 адв., 53 адв.

[37] На той момант ужо быў удаўцом.

[38] НГАБ. Ф. 136, воп. 13, спр. 644, арк. 89, 134 адв.

[39] Зрэшты, не ўсе. Тыя ж Мікалайчыкі-Навіцкія ў гэтым годзе былі запісаны прыгоннымі сялянамі (НГАБ. Ф. 333, воп. 9, спр. 21, арк. 857 адв.–863).

[40] НГАБ. Ф. 1783. воп. 1, спр. 20, арк. 22 адв.–23; Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 2: Б. – Мінск: НАРБ, 2007. – С. 312–313.

[41] НГАБ. Ф. 136, воп. 13, спр. 642, арк. 26 адв., 27 адв., 28, 31.

# СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

| | |
|---|---|
| адв. | адварот |
| арк. | аркуш |
| арт. | артыкул |
| аўстр. | аўстрыйскі |
| в. | вёска |
| вак. | ваколіца |
| ваяв. | ваяводства |
| ВКЛ | Вялікае Княства Літоўскае |
| вобл. | вобласць |
| вол. | воласць |
| воп. | вопіс |
| вул. | вуліца |
| вял. | вялікі |
| в. а. | выконваючы абавязкі |
| г. | 1) год; 2) горад |
| гг. | гады |
| гл. | глядзі |
| ГТ | Галоўны Трыбунал |
| гр. | граф |
| губ. | губерня |
| дзес. | дзесяціна |
| ДДС | дваранскі дэпутацкі сход |
| жан. | жаночы |
| засц. | засценак |
| зл. | злоты |
| іл. | ілюстрацыя |
| інш. | іншыя |
| кап. | капейка |
| кн. | князь |
| літ. | літоўскі |
| м. | мястэчка |
| маёнт. | маёнтак |
| муж. | мужчынскі |
| нар. | народжаная |
| пав. | павет |
| пал. | палова |
| пол. | польскі |
| прус. | прускі |
| р. | рака |
| рас. | расійскі |
| руб. | рубель |
| с. | сяло |
| Св. | Святы(ая) |
| СПб. | Санкт-Пецярбург |
| спр. | справа |
| ст. | 1) станцыя; 2) ступень; 3) стагоддзе |
| стст. | стагоддзі |
| тыс. | тысяча |
| укл. | уклейка |
| уроч. | урочышча |
| у т. л. | у тым ліку |
| ф. | фонд |
| фальв. | фальварак |
| хр. | хрышчаны(а) |
| хут. | хутар |
| чыг. | чыгуначны |

# УМОЎНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ

| | |
|---|---|
| N. | (невядомае імя) |
| ∞ | шлюб |
| v. | (voto) тут: у шлюбе |
| * | нарадзіў(ла)ся |
| † | памёр(мерла) |
| ~ | прыблізна, каля |

## АСАБОВЫ ПАКАЗАЛЬНІК


Аборскі Гіляры, падкаморы мінскі 524, 581
Аборскі Тамаш, маршалак павятовы мінскі 569, 581
Аборскі Францішак, мечнік мінскі 145, 146
Аборскі Юзаф, ротмістр мінскі 267
Аборскія 147
Абрагімовіч Марыяна, v. Заблоцкая 53
Абрамовіч Алена, v. Зяновіч 492
Абрамовіч Марыяна, v. Звяровіч 321
Абрамовіч Разалія, v. Зубовіч 406
Абрамовіч, нар. Коцел, Барбара 467
Абрампальская Кацярына Янаўна, v. Зелязніцкая 341
Абрампальскі N. 294
Абрампальскі Аўгустын, пісар земска-павятовы дзісенскі 294
Абрампальскі Гіляры 294
Абрампальскі Міхал 602
Абрампальскі Тадэвуш, суддзя 2-га Дэпартамента Мінскага Галоўнага суда 342
Абубазавіч Ахмат, гл. Ахмат Абубазавіч
Абуховіч N. 584
Абуховіч Антаніна, v. Зубоўская 411
Абуховіч Вінцэнт, лоўчы мазырскі 305
Агінская N., княгіня 159
Агінская Алена, v. Завіша, князёўна 115
Агінская Алена, княгіня 152
Агінская Карнелія, v. Зяновіч, князёўна 488
Агінскі Марцін, кн., староста гродзенскі 292
Агінскі Мікалай-Францішак, кн., падскарбі надворны літ. 568
Агінскі Міхал-Казімір, кн., гетман літ. 116
Агінскі Міхал-Клеафас, кн., падскарбі літ. 481, 562
Агінскі Тадэвуш, кн., ваявода троцкі 542
Агінскія, князі 102, 262, 316
Адамаў Ягор, селянін 601
Адамовіч N., v. Іздэбская 611
Адамовіч Марыяна, v. Іванкевіч 502
Адамовіч Станіслаў 515
Адамовіч Уршуля, v. Іллясевіч 614
Адамовіч, нар. Дытрык, Аляксандра 515
Адахоўская Барбара Казіміраўна, v. Заліўская 210
Адзікіч Феліцыяна, v. Заблоцкая 53
Адынец Кацярына, v. Замбрыцкая 232
Адынец Марцін 232
Адынец Францішак 233
Адынец Францішка, v. Зароская 274
Адынец, нар. Багуцкая, Апалонія 233
Азямблоўская, нар. Хаецкая, Зоф’я 432
Азямблоўскі Віктар, рэгент земска-павятовы мінскі 429
Азямблоўскі Канстанцін, стражнік 432
Азямблоўскі Ксаверы, рэгент падкаморскі ігуменскі 429
Акінчыц Антаніна, гл. Акінчыц Марыяна Станіславаўна
Акінчыц Марыяна (Антаніна) Станіславаўна, v. Змяеўская 385
Акнінская Іягана, гл. Асінская Іягана

Аколава Агата, v. Загорская 145
Аколава, нар. Ісаевіч, Петранэля 630
Аколавы 540
Аколаў Іаахім 630
Аколаў Казімір 254
Акольская Стэфанія, v. Збароўская 306
Акрасімская Ганна 375
Аксяневіч Вікторыя, v. Зянковіч 461
Акуліч N., v. Забродская 60
Акуліч Марыя Іванаўна, v. Зубкоўская 394
Акуліч Тадэвуш, уніяцкі святар 316
Акушка N. 432
Алапеус N. 457
Александровіч Алена, v. Ірыковіч 624
Александровіч Зоф'я Рызманаўна, v. Іллясевіч 614
Александровіч Матэвуш Сымонавіч 129
Александровічы 209
Алелькавіч-Слуцкая Зоф'я, v. княгіня Радзівіл 132
Алелькавіч-Слуцкі Сямён, кн. 484
Алелькавіч-Слуцкі Юрый II Юр'евіч, кн. 484
Алелькавіч-Слуцкі Юрый III Юр'евіч, кн. 132, 436, 445
Алена Яраславіч, княгіня 53
Алендская Ганна, гл. Алендская Іягана
Алендская Іягана (Ганна), v. Іваноўская 529
Алендская Крысціна, v. Зубовіч 405
Алендскі Андрэй, суддзя гродскі мінскі 481
Алендскі Ян, шамбялян 639
Альпінская Цэцылія Андрэеўна, v. Івашкевіч 569
Альхімовіч Магдалена, v. Ігнатовіч 597
Альшэўская Аляксандра, v. Ігнатовіч 600
Альшэўская Брыгіда (Ядвіга), v. Заліўская 210
Альшэўская Элеанора, v. Ісаевіч 629
Альшэўская Ядвіга, гл. Альшэўская Брыгіда
Альшэўская, нар. Шчыгельская, Марыяна 209
Альшэўскі Пётр 209
Алявінская Ева, v. Замайская 227
Алякевіч Агата, v. Іваноўская 524
Аляксандр, кароль пол., вял. кн. літ. 483
Аляксандр I, імператар рас. 33, 34, 116
Алярд Людвіка, v. Згарэльская 325
Аляхновіч Агата, v. Іваноўская 530
Аляшкевіч, нар. Юдзевіч, Ганна, 2 v. Загорская 148
Андраеўская Марыя, v. Загорская 142
Андраеўскі Станіслаў Марцінавіч 467
Аніноўская Марыяна, v. Юшкевіч 424
Аніхімоўская Караліна, v. Уласевіч 321
Аніхімоўская Элеанора, v. Іваноўская 519
Аніхімоўскі Антоні 519
Аніхімоўскі Каятан 519
Аніхімоўскі Пётр 519
Аношка Марыяна, v. Зянкевіч 454
Аношка Пракседа, v. Зубоўская 414
Аношкавіч Ждан, гл. Ждан Аношкавіч
Антаневіч Алена, v. Ілляшэвіч 618
Антаневіч Аляксандр 271
Антаневіч Кацярына, v. Закрэўская 161

Антаневіч, нар. Замбрыцкая, Юзэфа 242
Антаневіч, нар. Казакевіч, Настасся Янаўна 271
Антановіч Рэгіна, v. Івашкевіч 574
Антусевіч Петранэля, v. Залеская 201
Антусевіч Разалія, v. Заянчкоўская 294
Антушэвіч Антаніна, v. Залеская 202
Антушэвіч Сымон 201
Антушэвіч Тэкля, v. Івашкевіч 562
Апановіч Алена Парфёнаўна, v. Забродская 61
Арамовіч N., 193
Арамовіч Ежы 611
Арамовіч, нар. Няшэўская, Ганна 611
Арамовіч-Літавор Францішак 98
Арахавенская, нар. Зяновіч, Кацярына 487
Арахавенскі Дамінік, падчашы полацкі 487
Арахоўская, нар. Загароўская, Анеля 129
Арахоўскі Ян, харужы войскаў пол. 129
Арашкоўская Тэрэза, v. Канаплянская 430
Ардынец N., ротмістр полацкі 496
Ардынец, нар. Янкоўская, Тэрэза, 1 v. Зяноўская 496
Арліцкі Караль 432
Арлоўская Дарота Рафалаўна, v. Закрэўская 159
Арлоўскі Юзаф 508
Арцішэўская Канстанцыя, v. Заліўская 210
Арцішэўская Кацярына, v. Зароская 269
Арцюкевіч Антоні, парабак 574
Арэшка Людвік, стольнік пінскі 105
Асановіч Марыяна (Марыя), v. Іллясевіч 614
Асановіч Мацей, мула лоўчыцкі 89
Асіеўскі N. 161
Асінская (Акнінская) Іягана, v. Зяновіч 492
Асіповіч N. 365
Асіповіч Юлія Норбертаўна, v. Івашкевіч 549
Асіпоўская Петранэля, v. Зароская 266
Аскерка Антоні, генерал-маёр войскаў літ. 211
Аскерка Геранім, падкаморы парнаўскі, шамбялян 528
Аскерка Ігнат, падкаморы рэчыцкі 110
Аскерка Ігнат, харужы завілейскі 211
Аскерка Ізыдар-Амброзі, падкаморы рэчыцкі 324
Аскерка Марцін, каштэлян ашмянскі 210
Аскерка Фларэнты, суддзя земскі мазырскі 110
Аскерка Францішка-Ганна, v. Зяновіч 479
Асмольскі N. 487
Асноўскі Ян, селянін 341
Астаневіч Геранім, капітан 238
Астаневіч Іван Раманавіч 611
Астаноўка Юзаф 239
Астаноўка, нар. Замбрыцкая, Пракседа 239
Асташкевіч Міхал 568
Асташэўская Настасся, v. Зянковіч 461
Астроўская Марыяна, v. Івашкевіч 574
Астроўская Элеанора, v. Ігнатовіч 594

Астроўскі Юзаф Янавіч 554
Асяеўская Агаф'я, v. Забродская 60
Асяеўская Феліцыяна, v. Зянковіч 470
Асяцімская N. 35
Асяцімская Юлія, v. Замайская 227
Аўгуст II, кароль пол., вял. кн. літ. 115, 313, 486, 487, 492, 588
Аўгуст III, кароль пол., вял. кн. літ. 31, 32, 87, 182, 195, 313, 487, 565
Аўлачымская Людвіка, v. Замбрыцкая 232
Аўлачымскі Вінцэнт, ротмістр 42
Аўлачымскія 208, 233
Аўрушэвіч-Глебка Тэрэза, гл. Глебка-Аўрушэвіч Тэрэза
Аўсяная Францішка, v. Ісаевіч 635
Аўсяная, нар. Занеўская, Кацярына Андрэеўна, 2 v. Гуйская 255
Аўсяны Геранім Даніэлевіч 255
Аўсяны Дамінік-Тэадор Даніэлевіч 255
Аўсяны Леан Станіслававіч 255
Аўсяны Станіслаў Даніэлевіч 255
Аўсяны Ян Даніэлевіч, плябан талачынскі 255
Аўсяны Ян Станіслававіч 255
Аўсяны Ян, суддзя межавы барысаўскі 584
Аўсяны Ян, харужы ваўкавыскі 255
Ахацімская Феліцыяна, v. Заблоцкая 43
Ахмат Абубазавіч 39
Ахрымовіч Юзэфа, v. Закрэўская 164

Бабіцкая Марыя, v. Іваноўская 511
Бабіцкая Петранэля Ігнатаўна, v. Закрэўская 163
Бабіцкая Эмілія Францішкаўна, v. Закрэўская 165
Бабіцкая, нар. Закрэўская, Валерыя 163
Бабіцкая, нар. Руткоўская, Марыя Міхалаўна 163
Бабіцкі Стэфан Мацеевіч 163
Бабкоўская Настасся, v. Іванкевіч 501
Бабкоўская Фрузына, v. Іванкевіч 501
Бабнеўская Марыяна Юзафаўна-Міхалаўна, v. Заліўская 210
Бабнеўскі Юзаф-Міхал, войскі кіеўскі 210
Баброўская N., v. Замайская 226
Баброўская Кацярына, v. Заліўская 215
Баброўская Кацярына, v. Зуеўская 416
Баброўская Сідалія, v. Зуеўская 416
Багатка Караль 182
Багатка, нар. Залеская, N. 182
Багаткевіч Людвіка, v. Згерская 328
Багданкевіч Вікторыя, v. Зуеўская 416
Багдановіч N. 107, 158, 270
Багдановіч Алена, v. Ісаевіч 628
Багдановіч Вінцэнт, падкаморы вілейскі 577
Багдановіч Гальяш Янавіч 176
Багдановіч Ганна Андрэеўна, v. Івашкевіч 555
Багдановіч Канстанцыя, v. Замбрыцкая 233
Багдановіч Людвіка 401
Багдановіч Людвіка, v. Ісаевіч 627
Багдановіч Марыяна, v. Завістоўская 103
Багдановіч Ружа, v. Іллясевіч 614
Багдановіч Францішка, v. Змяеўская 385
Багдановіч Юзэфа, v. Залеская 198
Багдановіч Ян Мацеевіч 176
Багдановічы 104, 107

Багданская Канстанцыя Янаўна, v. Здзяхоўская 334
Багінская Аляксандра, v. Засадская 281
Багрыцэвіч Ганна, v. Залуская 223
Багуслаўская Ганна, v. Забароўская 14
Багуслаўскія 14
Багуцкая Апалонія, v. Адынец 233
Багушэвіч Зоф'я, v. Міцкевіч 398
Багушэвіч Канстанцыя, v. Жыжэмская 573
Багушэвіч Тадэвуш, палкоўнік Мінскага ваяв. 256
Багушэвіч Тэкля, 1 v. графіня Тышкевіч, 2 v. Пятроўская, 3 v. Здзяхоўская 335
Багушэвіч, нар. Галінская, Марыяна, 2 v. графіня Тышкевіч 335
Багушэвіч-Мінькоўскі Стэфан, падчашы аршанскі 535
Баемская Саламея, v. Залуская 220
Базарскі Лаўрук, селянін 103
Базарскі Юрка, селянін 103
Базарэвіч Міхал 574
Байкоўская Дарота, v. Залеская 197
Байрашэўская Айша, v. Іллясевіч 615
Бака Зузана, v. Івашкевіч 541
Бакіноўская Настасся, v. Івінская 592
Бакіноўскія Зоф'я, v. Кулеўская 59
Бакрэй Базыль 393
Бакрэй, нар. Зубкоўская, Зоф'я 393
Бакшанская N., v. Іваноўская 517
Балвановіч Марыяна (Марыя) Андрэеўна, v. Забродская 74
Балевіч Раймунд 574
Балевіч Сымон Ежавіч, каморнік браслаўскі 574
Балеста N., v. Завадская 98
Баляш Баніслава Людвікаўна, v. Занеўская 253
Бандарэнкі 224
Банькоўская Настасся, v. Збарамірская 300
Баравік Антоні Юзафавіч 376
Баран Іван, селянін 157
Барановіч Зоф'я, v. Івашкевіч 570
Барановіч Юзаф 584
Бараноўская Агата, v. Зяневіч 437
Бараноўская Алена, v. Іскрыцкая 638
Бараноўская Ганна, v. Забродская 62
Бараноўская Ганна, v. Заянчкоўская 297
Бараноўская Еўдакія (Ядвіся) Дзям'янаўна (Міхайлаўна), v. Забродская 77
Бараноўская Ірына Паўлаўна, v. Івашкевіч 561
Бараноўская Марцэля, v. Зяневіч 437
Бараноўская Настасся Іосіфаўна, v. Зяневіч 439
Бараноўская Францішка (Фрузына), v. Забродская 65
Бараноўская Фрузына, гл. Бараноўская Францішка
Бараноўская Ядвіга, v. Іваноўская 531
Бараноўскі N. 58
Баранцэвіч Марцін 420
Бараны 157, 158
Баратынская Марцэля (Марцыяна) Ануфрыеўна, v. Застоская 268
Барацінская N., княгіня 372
Бардзінскі N. 622
Баркоўская Алена, v. Іваноўская 507
Баркоўская Марыяна, v. Завадская 90
Баркоўскі Мікалай 77
Бародзіч N. 51
Бародзіч Іягана, v. Заянчкоўская 296

Бародзіч Леанард, староста ярашэўскі 157
Бародзіч Рэгіна, v. Заблоцкая 51
Бароўская Альжбета, v. Зайкоўская 157
Бароўская Магдалена, v. Закрэўская 173
Барсук N. 545
Барсук Юзэфа Міхалаўна 253
Барташэвіч N. 578
Барташэвіч Алена, v. Замбрыцкая 234
Барташэвіч Альжбета, v. Замбрыцкая 233
Барташэвіч Ганна Дзям'яўнаўна, v. Замбрыцкая 249
Барташэвіч Кацярына, v. Замбрыцкая 233
Барташэвіч Мальвіна Пятроўна, v. Зубкоўская 394
Барташэвіч Міхаліна, v. Змяеўская 385
Барташэвіч Тэадора Юзафаўна, v. Змачынская 360
Барташэвіч, нар. Скроцкая, Ганна, 1 v. Заленская, 2 v. Рынгоўская 178
Барташэўскі Ян 175
Баршчэўская Канстанцыя, v. Зімодра 350
Баршчэўская Тэрэза, v. Івашкевіч 542
Барымоўскі Банавентура, канонік інфлянцкі 183
Барымоўскі Тадэвуш, суддзя гродскі слонімскі 183
Барысевіч Ганна, v. Забродская 80
Барысевіч Францішка, v. Іванкевіч 503
Барысевіч Яўгенія Юзафаўна, v. Зянковіч 466
Барычэўскі Караль 86
Барычэўскі Стэфан 86
Барэйка Настасся, v. Забароўская 15
Барэйша Анеля Алаізіеўна-Мікалаеўна, v. Завітневіч 110
Барэйшы 115
Барэнцкі Антоні, інстыгатар літ. 100
Барэцкая Ганна 430
Басарабскія-Танфэкленбургі, гл. Танфэкленбургі-Басарабскія
Басарэвіч Маціяш 568
Баса-Стратовіч Самуэль, гл. Стратовіч-Баса Самуэль
Баторы Стэфан, гл. Стэфан Баторы
Бахматовіч Бянігна, v. Залуская 220
Бахматовіч Станіслаў 568
Бацяноўская Марыяна, v. Заблоцкая 42
Бачынская Алена, v. Зянкевіч 458
Бачынская Ганна, v. Завадская 98
Бачынская Ганна, гл. Бучынская Ганна
Бачэўская Юльяна, v. Іваноўская 529
Бейшар Юзэфа, v. Занеўская 253
Белазор N. 313
Белазор Альжбета, v. Забела 31
Белазор Брыгіта 210
Белазор Ганна, v. Забела (жонка Ігната З.) 32
Белазор Ганна, v. Забела (жонка Міхала З.) 31
Белазор Клеменс 210
Белазор Клеменс, староста рэвельскі 420
Белазор Тэкля 210
Белазор, нар. Жарніцкая, Ганна 210
Белазор, нар. Ісайкоўская, Альжбета-Іягана 152
Белазоўская Альжбета, v. Заянчкоўская 296
Беліковіч Разалія Юзафаўна, v. Завадская 96

Беліковіч Францішак, старшыня 2-га Дэпартамента Віцебскага Галоўнага суда 598
Беліновіч-Бяліна Леанціна-Браніслава, v. Змачынская 376
Бельская Ганна Андрэеўна, v. Змачынская 370
Бельская Крысціна, v. Ігнатовіч 597
Бельскі Іаахім, храніст 344
Беразоўская Юліяна, v. Івашкевіч 561
Беразоўскі Мітрафан Васільевіч 73
Берасневіч Вінцэнт, рэгент гродскі слонімскі 128
Берасневіч Дамініка, v. Завадская 90
Берасневіч, нар. Быкоўская, Антаніна, 1 v. Загароўская 128
Берасневіч, нар. Загароўская, Касільда 129
Берла Францішка Антонаўна, v. Закрэўская 159
Білевіч Януш 30
Білевіч, нар. Давідовіч, Барбара, 1 v. Забела 30
Більдзюкевіч Саламея, v. Зянковіч 470
Більман N. 563
Біруля Антаніна, v. Івашкевіч 551
Біруля Разалія, v. Зянковіч 461
Блюм, фон, Соф'я-Вільгельміна (Соф'я-Кацярына), v. Івашкевіч 591
Богвіл Элеанора, v. Загорская 146
Богуш Ганна, v. Івашкевіч 546
Бона Сфорца, каралева польская, вялікая княгіня літоўская 22, 623
Бондары 222
Бонін Ганна, v. Бярнацкая 106
Бонін Ян Лаўрынавіч 106
Бонін, нар. Кернажыцкая, Ева 106
Борзабагатая Мальвіна, v. Засадская 281
Борзабагаты Францішак, рэгент межавы слуцкі 426
Боўтуць Бенядыкт, староста пякаркаўскі 390
Боўтуць, нар. Зубка, Зоф'я 390
Боўфал Магдалена, гл. Мушынская Магдалена
Бохвіц N. 371
Бразоўская Анеля Вінцэнтаўна, v. Ісаевіч 630
Бразоўская Дарота Фёдараўна (Дар'я Васільеўна), v. Забродская 68
Бразоўская Ізабэла Ігнатаўна, v. Завадская 92
Бразоўская Марыяна, v. Забродская 79
Бразоўская Тэрэза, v. Івашкевіч 561
Бразоўская, нар. Здзяхоўская, Уладзіслава 337
Бразоўскі Мікалай, пробашч мікалаеўшчынскі, дэкан слуцкі 544
Бракарскі N. 380
Бральніцкі Станіслаў-Ежы 175
Бранавіцкая Агата Андрэеўна, v. Забродская 77
Бранавіцкая Марыяна, v. Корбут 424
Бранавіцкая Уршуля, v. Зубовіч 402
Браноўская Ганна 238
Браноўскі Валенты 238
Бранцаў N., паручнік 616
Брастоўскі Аўгуст, гр. 577
Брацішэўская, нар. Залеская, Алена 195
Брацішэўскі Стэфан 195
Броска Казімір 86
Брыдыцкая Ева, v. Занятоўская 264
Брылеўская Кацярына, v. Занкевіч 259

Брылеўская Францішка, v. Змачынская 364
Брындза Алена, v. Івашкевіч 573
Брындза Мацей, скарбнік навагрудскі 103, 014
Брындза Ян 573
Брындза, нар. Урачынская, Барбара 104
Брэская Юзэфа, 1 v. Завіша, 2 v. Забела 35
Будны Мікалай, прыёр Глыбоцкага карmeліцкага кляштара 613
Будрэвіч Элеанора, v. Заблоцкая 40
Буйвід Станіслаў 208
Буйвід, нар. Заліўская, Марына 208
Буйка Ежы 267
Буйка Юзэфа, v. Зароская 273
Буйка, нар. Зароская, Тэадора 267
Буйневіч Тэадор 132
Буйніцкая, нар. Замбрыцкая, N. 233
Буйніцкі N. 239, 241, 453
Буйніцкі Алаізі, маршалак павятовы дзісенскі 497
Буйніцкі Стэфан, суддзя межавы дзісенскі 624
Буйніцкія 240
Букоўская Алена Дамінікаўна, v. Забела 22
Букрэй Рэгіна, v. Лешчылоўская 593
Булат Карнелія Янаўна, v. Івашкевіч 549
Булат Марыяна, v. Іваноўская 531
Булгак N. 62, 65, 68, 71
Булгак Бенядыкт 529
Булгак Дарота, v. Залеская 199
Булгак Язафат, уніяцкі епіскап брэсцкі 401
Булгакі 562
Булгарын N. 371
Булгарын Міхал, асэсар Слуцкага ніжняга земскага суда 133, 438, 639
Булынка (?) Ганна, v. Зянковіч 461
Буневіч Марына Рыгораўна, v. Забродская 59
Бурак Мацей Трахімавіч, селянін 98
Буракоўская Кацярына, v. Зянкевіч 458
Бурачэўская Марыяна, v. Ігнатовіч 601
Бурая N., v. Іздэбская 611
Бурба Кацярына, v. Зяльвовіч 429
Бурла Лаўрын, селянін 525
Бурчыц Варвара Андрэеўна, сялянка 391
Бурынская (Збурынская) Францішка Сымонаўна, v. Ісаевіч 630
Бурынская Марыяна, v. Зубоўская 411
Бурынскі N. 487
Буткевіч Ефрасіння, v. Зімніцкая 346
Буткевіч Тэрэза, v. Івашкевіч 541
Буткевіч-Каперская Кацярына, гл. Каперская-Буткевіч Кацярына
Буткевіч-Каперскі Леапольд Міхалавіч, гл. Каперскі-Буткевіч Леапольд Міхалавіч
Бутовіч Матрона 171
Бутовіч Ян 171
Бутрым Марта Марцінаўна, v. Бялабрэская 30
Бутрымовіч N. 360
Бухавецкая, нар. Завістоўская, Марыяна, 1 v. Дэголін 109
Бухавецкі Тамаш 109
Бухавецкія 535
Буцвілоўская Эмілія Феліксаўна, v. Закрэўская 166
Бучынская (Бачынская) Ганна, v. Іваноўская 531
Бушкевіч Базыль, селянін 446
Бушкевіч, нар. Мястоўская, Магдалена, сялянка 446

Быкава, нар. Назімава, Усціння, 2 v. Іванава 497
Быкаў Капітон Юр’евіч 497
Быкаў Юрый Іванавіч 497
Быкоўская Антаніна, 1 v. Загароўская, 2 v. Берасневіч 128
Быкоўская, нар. Граковіч, Агата Янаўна 424
Быкоўскі N., падкаморы мінскі 223, 502
Быкоўскі Ксаверы, суддзя межавы навагрудскі 520
Быкоўскі Стэфан, харужы мінскі 424
Быкоўскі Фларыян, харужы мінскі 267
Быкоўскі Францішак 424
Былеўская Ганна, гл. Дукевіч Ганна
Былінскі Казімір Крыштафавіч 182
Былінскі Рафал Крыштафавіч 182
Былінскі Уладзіслаў Крыштафавіч 182
Былінскія 182
Быстрам N. 48, 62, 65, 66, 69
Быстрам Дамінік, генерал-маёр войскаў пол. 595
Быстрам Ян, дваранін скарбу літ. 595
Бэрн Гедэон, харужы войскаў літ. 400
Бяйнацкая Марыяна (Марцыяна), v. Іваноўская 529
Бялабрэская, нар. Бутрым, Марта Марцінаўна 30
Бялабрэскі Станіслаў Готартавіч 30
Бялавескі Станіслаў, ротмістр мазырскі 425
Бяласоўская Алена, v. Завістоўская 106
Бялахоўская Францішка, v. Кміта 20
Бяліна-Беліновіч Леанціна-Браніслава, гл. Беліновіч-Бяліна Леанціна-Браніслава
Бялькевіч N. 59
Бялькевіч Базыль 65
Бялькевіч Ганна, v. Загароўская 132
Бялькевіч Марыяна Янаўна, v. Забродская 65
Бялькевіч Настасся Фёдараўна, v. Зяневіч 438
Бялькевіч Юзаф 65
Бяляўская (Свянціцкая) Магдалена, v. Іванская 538
Бяляўская, нар. Заленская, Марыяна (Марта) 178
Бяляўскі Пётр 178
Бянецкая (Бяняцкая) Людвіка, v. Закрэўская 172
Бянклеўскі Ануфры 103
Бянклеўскі Вінцэнт 103
Бянклеўскі Міхал 103
Бянклеўскі Тадэвуш 103
Бяньковскі Ігнат Марцінавіч 264
Бяняцкая Людвіка, гл. Бянецкая Людвіка
Бярковіч Фася, яўрэйка 145
Бярковіч Шася, яўрэй 145
Бярнацкая Аўдоцця, v. Зянкевіч 448
Бярнацкая Рахеля, v. Зянкевіч 449
Бярнацкая Элеанора, v. Змяеўская 385
Бярнацкая Юлія Тэафілаўна, v. Івашкевіч 549
Бярнацкая, нар. Бонін, Ганна 106
Бярнацкі Станіслаў 106
Бярновіч N. 62, 66
Бярновіч Міхал, суддзя земскі навагрудскі, маршалак павятовы слуцкі 17, 98
Бярновіч Сярвацы 584

Вагінская, нар. Хацішэўская, Кацярына, 2 v. Заблоцкая 40
Вагінскі Павел 40

Важынская Элеанора, v. Зяновіч 488
Вазгірд N. 43
Вазгірд Міхал, стольнік троцкі 489
Вазгірд, нар. Зяновіч, Вераніка 489
Вазгірды 597
Вайдзевіч Феліцыян 536
Вайдзевіч Францішак, ротмістр мінскі, суддзя гродскі мінскі 535
Вайдзевіч, нар. Праздзецкая, Ганна, 2 v. Замайская 535
Вайдылота Мацка 617
Вайніловіч N. 639, 640
Вайніловіч Адам, падкаморы навагрудскі 280
Вайніловіч Антоні, маршалак павятовы слуцкі 531
Вайніловіч Іягана Іванаўна, гл. Вайніловіч Марына Іванаўна
Вайніловіч Марына (Іягана?) Іванаўна, v. Зубкоўская 393
Вайніловіч Марыяна, v. Іваноўская 535
Вайніловіч Цэзарыя Каралеўна, v. Зяновіч 495
Вайніловічы 183
Вайніцкая Разалія 211
Вайткевіч Аўдоцця, v. Замбрыцкая 240
Вайткевіч Кацярына, v. Заборская 56
Вайткевіч Настасся, v. Ігнатовіч 599
Вайцяховіч Тэрэза, v. Зянковіч 461
Вайцяхоўская Даminіка, v. Зяневіч 445
Вайцяхоўская Канстанцыя, v. Івашкевіч 576
Валавічэнка Міхаіл, мешчанін 619
Валадковіч N., v. Замайская 226
Валадковіч Еўдакія Якаўлеўна (Андрэеўна), v. Забродская 77
Валадковіч Марцін-Казімір, пісар земскі мінскі 568
Валадковіч Рыгор Базылевіч (Тамашавіч) 560
Валадковіч Рыгор Рыгоравіч 560
Валадковіч Стэфан, падсудак земскі мінскі 534
Валадковіч Схаластыка, v. Валодзька 529
Валадковіч Тадэвуш, суддзя земскі мінскі 587
Валадковіч Францішак 252
Валадковіч Юзаф, генерал войскаў пол. 536
Валадковіч Ян, маршалак павятовы вілейскі 350, 587
Валадковіч, нар. Івашкевіч, Аўдоцця (Рэгіна) 560
Валадковіч, нар. Ратынская, Апалонія 252
Валадковіч, нар. Слізень, Ружа, 2 v. Іваноўская 534
Валадковічы 253
Валасевіч Антаніна, v. Зяльвовіч 430
Валасевіч Петранэля, v. Залеская 191
Валасецкая Алена, v. Зароская 273
Валасовіч Феліцыян 586
Валатовіч Багуміла, v. Іванкевіч 502
Валатовіч Ганна, v. Зяльвовіч 430
Валатоўская Пелагея Іванаўна, v. Забродская 65
Валентыновіч Ян, асэсар Вілейскага земска-павятовага суда 524
Валіцкая Рэгіна, v. Зубовіч 401
Валіцкі N. 622
Валкоўская Ганна, v. Івашкевіч 589
Валовіч Ганна, v. Укольская 115
Валовіч Ксаверы, шамбялян 324
Валовіч Марцыян, харужы мсціслаўскі 152
Валовіч Рыгор, дзяржаўца ляхавіцкі 16, 17

Валовіч Станіслаў, падкаморы рэчыцкі 379
Валовіч Тэадора, v. Завіша 115
Валовіч Тэадора, v. Зяновіч 485
Валодзька Ігнат, стражнік аршанскі 528
Валодзька, нар. Валадковіч, Схаластыка 529
Валодзька, нар. Корсак, Тэрэза 528
Валодзькі 528
Валунскі Антоні-Францішак 334
Валуцкая Ганна, 1 v. Кіяноўская, 2 v. Сакалоўская 321
Вальмус Эмілія, v. Залеская 200
Вальніцкая Генрыета Фларыянаўна, v. Ісаевіч 635
Вальтэр Ігнат Міхалавіч 90
Вальтэр, нар. Лойка, Феліцыяна, 1 v. Завадская 90
Вальчэўская Агата, v. Занеўская 252
Ванікевіч Ежы 573
Ванікевіч, нар. Івашкевіч, Альжбета, 2 v. Пузіноўская 573
Ванькевіч Еўдакія Апалонаўна, гл. Ванькевіч Ядвіга Антонаўна
Ванькевіч Еўдакія Міхайлаўна, гл. Ванькевіч Ядвіга Антонаўна
Ванькевіч Юдыта, гл. Ваньковіч Юдыта
Ванькевіч Ядвіга Антонаўна (Еўдакія Апалонаўна, Еўдакія Міхайлаўна), v. Забродская 65
Ванькевіч Ядвіга, v. Зуеўская 416
Ваньковіч (Ванькевіч) Юдыта, v. Заліўская 208
Ваньковіч N. 160
Ваньковіч N., памешчыца 574
Ваньковіч Алена 455
Ваньковіч Альжбета, гл. Ваньковіч Лізавета Фёдараўна
Ваньковіч Апалінары, маршалак павятовы мінскі 104
Ваньковіч Ганна, v. Карніцкая 401
Ваньковіч Дар’я 65
Ваньковіч Зоф’я 268
